ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 21 (7098) | Серада, 1 сакавіка 1944 г. | Цана 20 кап.

**„Звыш года Чырвоная Армія вядзе пабеданоснае наступленне, громячы арміі гітлераўскіх захватчыкаў і змятаючы іх з совецкай зямлі. За гэты час Чырвоная Армія паспяхова правяла зімовую кампанію 1942-43 г., выйграла летнія сражэнні 1943 г. і разгарнула пабеданоснае зімовае наступленне 1943-44 года. У гэтых бяспрыкладных у гісторыі войн кампаніях Чырвоная Армія з баямі прайшла на захад мясцамі да 1700 кілометраў, ачысціла ад ворага амаль тры чверці захвачанай ім совецкай зямлі“.**

(З загада таварыша Сталіна ад 23 лютага 1944 года).

## Усе сілы і сродкі на дапамогу нашай гераічнай Чырвонай Арміі

Горача вітаючы патрыятычны рух сваіх братоў—працоўных Украіны, працоўныя вызваленых раёнаў нашай вобласці далучаюцца да агульнага ўсенароднага патрыятычнага руху нашай краіны. Поўныя любві і ўдзячнасці да гераічнай Чырвонай Арміі, вызваліўшай іх з нямецка-фашысцкай няволі, вярнуўшай іх да жыцця, усімі сіламі сваёй душы яны імкнуцца як мага больш дапамагчы нашым доблесным воінам у іх барацьбе за поўны разгром ворага. Беззаветна працуюць яны над справай абароны, хутка аднаўляюць гаспадарку, разбураную нямецка-фашысцкімі акупантамі, уводзяць у строй прамысловыя прадпрыемствы і калгасы. Але гэтым не задавольваюцца пламенныя патрыёты нашай Радзімы. Імкнучыся наблізіць дзень нашай перамогі, яны з радасцю і задаволеннем кладуць зараз на алтар сваёй Айчыны свае працоўныя зберажэнні.

Першымі далучыліся да ўсеагульнага ўсенароднага руху працоўныя Лёзненскага раёна. Па аднаму толькі Сутоцкаму сельсовету на 25лютага сабрана на танкавую калону 115 тысяч 282 рублі.

„Жадаючы дапамагчы Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ненавіснага ворага,—гаворыць на мітынгу старшыня калгаса „Сігнал“, Сутоцкага сельсовета, тав. Шыцік,—я ўношу на будаўніцтва танкавай калоны „Вызвалены Лёзненец“ 5 тысяч рублёў“. Калгаснікі гэтага калгаса за адзін толькі дзень сабралі і здалі на пабудову танкавай калоны 21.900 рублёў наяўнымі грашыма. Збор сродкаў прадаўжаецца.

10 тысяч рублёў унёс на будаўніцтва танкаў партызан Айчыннай вайны, зараз намеснік старшыні Лёзненскага Райвыканкома тав. Кажуноў. „Няхай пабудаваныя намі танкі знішчаюць фашысцкіх сабак“,—гаворыць тав. Кажуноў, выступаючы на мітынгу перад працоўнымі. За некалькі дзён па Лёзненскаму раёну сабрана 562.096 рублёў.

У працоўных рублях, адданых патрыётамі вызваленых раёнаў Віцебшчыны на справу абароны Радзімы, увасоблена спапяляючая нянавісць да нямецка-фашысцкіх захватчыкаў, якія залілі крывёю, усеялі руінамі прасторы вольнай і шчаслівай беларускай зямлі.

Выдатны пачын працоўных Лёзненшчыны горача падтрымалі ўсе працоўныя вызваленых раёнаў нашай вобласці. Праходзіўшы нядаўна сход абласнога партыйнага актыва горача падтрымлівае ініцыятыву лёзненцаў. Прынята аднадушнае рашэнне шырока разгарнуць збор сродкаў на ўмацаванне магутнасці Чырвонай Арміі.

Аграном абласнога зямельнага аддзела тав. Орэхаў унёс на пабудову танкавай калоны больш 11 тысяч рублёў. „Гэтыя сродкі,—гаворыць ён,—я аддаю для хутчэйшага вызвалення маёй роднай зямлі ад фашысцкіх варвараў“.

„Мы дабіліся карэннага пералому ў вайне ў карысць нашай краіны і вайна зараз ідзе да канчатковай развязкі. Але совецкім людзям не прыстала спыняцца на дасягнутым, упівацца сваімі поспехамі, перамогу можна ўпусціць, калі ў нашых радах паявіцца супакоенне... Перамога цяпер блізка, але каб яе заваяваць, неабходна новае напружанне сіл, самаадданая работа ўсяго тыла, умелыя і рашучыя дзеянні Чырвонай Арміі на фронце“(СТАЛІН).

У працоўных зберажэннях, паступіўшых ужо з вызваленых раёнаў нашай вобласці на стварэнне новай тэхнікі для Чырвонай Арміі, гарыць імкненне нашага народа ўзброіць сваіх воінаў усёй неабходнай зброяй для поўнай і канчатковай перамогі, для хутчэйшага разгрома ворага. Інтарэсы Радзімы—вышэй за ўсё. Калі справа ідзе аб вызваленні роднай зямлі, аб абароне чэсці, свабоды і незалежнасці Айчыны,—усё для барацьбы, усё для перамогі!

Мільёны працоўных рублёў, шчодрай рукой укладзеныя сынамі Совецкай Беларусі ў справу абароны Радзімы, памогуць Чырвонай Арміі. Ператварыўшыся ў новыя калоны танкаў і армады самалётаў, магутны паток працоўных зберажэнняў абрушыцца на ворага ліўнем агню і сталі.

Аддадзім усе сілы і сродкі для справы перамогі над ненавісным ворагам!

## Ад Совецкага Інформбюро

### З аператыўнай зводкі за 28 лютага

На працягу 28 лютага на Пскоўскім напрамку нашы войскі, прадаўжаючы развіваць наступленне, авалодалі раённымі цэнтрамі Ленінградскай вобласці Карамышэва, Пажарэвічы, а таксама з баямі занялі больш 450 другіх населеных пунктаў і сярод іх буйныя населеныя пункты Егор'еўшчына, Скамарохава Гара, Тарошына, Бальшое Загор'е, Выстаўка, Сумская, Крукава, Бальшыя і Малыя Пецi, Зарэчча, Падгор'е, Філістава, Вязовіцы, Кустова, Адор'е, Цвень, Варыціна і чыгуначныя станцыі Тарошына, Бунева, Падседы, Вешкі, Карамышэва.

На паўночны-захад і на захад ад Новасакольнікі, нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі больш 200 населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты Слабада, (5 кілометраў на ўсход ад Нова-Ржэў), Клімава, Грывіна, Вешэліха, Бялькова, Тураўскія Халмы, Захарына, Заложжа, Заполле, Скокава, Чэрнецова, Бальшыя Баталкі, Мільгіно, Васькова, Сяргейцава.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў.

На працягу 27 лютага нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 21 нямецкі танк. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі знішчана 98 самалётаў праціўніка.

## Патрыятычны рух лёзненцаў

Працоўныя вызваленай часткі Лёзненшчыны, поўныя пачуццяў глыбокай падзякі сваёй вызваліцельніцы Чырвонай Арміі і гарачага жадання дапамагчы ёй хутчэй разграміць ненавіснага ворага, рашылі на сваіх сходах і мітынгах унесці са сваіх асабістых зберажэнняў, накопленых у час мірнай, шчаслівай працы, сродкі на пабудову танкавай калоны „Вызвалены Лёзненец“.

За некалькі дзён на будаўніцтва танкавай калоны па раёну сабрана 562.096 рублёў. Калгаснікі калгасаў Сутоцкага сельсовета ўнеслі 115.282 рублі.

На сходзе ў калгасе „Самалёт Леніна“ выступіў калгаснік Налівайкін.

— Немцы забілі майго любімага сына—партызана, —заявіў ён.—Я ўношу сродкі на будаўніцтва грозных танкаў. Няхай гэтыя машыны адпомсцяць немцамгадам за смерць майго сына, за нашы слёзы і пакуты,перажытыя ў фашысцкай няволі.

Партызан Айчыннай вайны, зараз намеснік старшыні Райвыканкома тав. Кажуноў, паслаў таварышу Сталіну пісьмо, у якім піша, што, горача жадаючы дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй разграміць гітлераўскіх людаедаў, ён унёс у аддзяленне Дзяржбанка са сваіх зберажэнняў 10 тысяч рублёў на будаўніцтва танкавай калоны. Старшыня калгаса „Сігнал“ тав. Шыцік унёс 5 тысяч рублёў.

В. БЫХАЎЦОЎ.

## Развіццё індывідуальнага і калектыўнага гародніцтва ў 1944 г.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР абавязаў абласныя і краявыя выканкомы і соўнаркомы рэспублік павялічыць у 1944 годзе пасяўныя плошчы пад індывідуальнымі і калектыўнымі гародамі, у параўнанні з мінулым годам, не менш, чым на 20 проц. Неабходна аказаць профсаюзным арганізацыям садзеянне ў яшчэ большым прыцягненні рабочых і служачых, а таксама сем'яў франтавікоў да ўдзелу ў апрацоўцы гародаў. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць шырокаму развіццю індывідуальнага і калектыўнага гародніцтва ў раёнах, вызваленых ад нямецка-фашысцкіх захватчыкаў.

Прапануецца перадаць прадпрыемствам і ўстановам пад калектыўныя і індывідуальныя гароды рабочых і служачых свабодныя землі гарадоў, пасёлкаў і дзяржаўнага зямельнага фонда на 5-7 год. Пад гароды павінны быць адведзены свабодныя землі пабліз ляжачых калгасаў, у палосах адчужэння чыгунак і па дагаворанасці з калгасамі не выкарыстоўваемыя імі землі. Лепшыя ўчасткі, размешчаныя бліжэй да населеных пунктаў, выдзяляюцца ў першую чаргу сем'ям ваеннаслужачых і інвалідам Айчыннай вайны. Адвод зямель пад індывідуальныя і калектыўныя гароды павінен быць закончан да 1 красавіка. За прадпрыемствамі і ўстановамі замацоўваюцца на 1944 год таксама землі калгасаў і соўгасаў, выдзеленыя ў 1943 годзе. Абласныя і краявыя выканкомы, соўнаркомы рэспублік павінны пры ўдзеле профсаюзных і зямельных органаў шырока разгарнуць сярод рабочых і служачых, якія маюць індывідуальныя і калектыўныя гароды, агратэхнічную прапаганду, неабходна распаўсюдзіць вопыт агароднікаў, якія атрымалі ў мінулым годзе высокія ўраджаі бульбы і гародніны. Неабходна дабіцца каб усе рабочыя і служачыя поўнасцю забяспечылі свае гароды насенным матэрыялам.

(ТАСС)

## Зверствы немцаў

У Мехаўскім раёне прыступіла да работы камісія па расследаванню зверскіх забойстваў нямецкімі разбойнікамі тысяч людзей-нявіннага мірнага насельніцтва—жанчын, дзяцей і старыкоў.

У камісію ўвайшлі работнікі медыцыны, пракуратуры, прадстаўнікі воінскіх часцей, прадстаўнікі совецкіх, партыйных і грамадскіх арганізацый.

З 24 лютага камісія прыступіла да раскопкі магіл. У адной з трох вялікіх магіл выяўлена больш тысячы чалавек совецкіх грамадзян, зверска забітых немцамі.

## Для працоўных раёна

Суражская партняжная арцель „Чырвоная Зорка“ арганізавалася і пачала сваю работу са снежня мінулага года.

Абслугоўваючы працоўных раёна, арцель ужо выканала 108 розных заказаў і больш чым на 11 тысяч рублёў рэалізавала сваіх вырабаў праз Райспажыўсаюз.

Ад рэалізацыі партняжных вырабаў арцель мае ў наяўнасці звыш 20 тысяч рублёў абаротных сродкаў.

ІВАШНЁЎ.



Палонных гітлераўцаў вядуць праз Ноўгарад.

# Будуюць млын і лесапілку

Гітлераўскія варвары спалілі Нова-Александраўскі ільнозавод. Ад завода застаўся толькі адзін абгарэлы каменны будынак машыннага аддзялення, ды выведзены немцамі са строя лакамабіль. Толькі гэта і напамінае нам аб былым размяшчэнні тут вялікага прамысловага збудавання.

Пачынаючы аднаўленчыя работы, працоўныя вызваленай Суражчыны рашылі на месцы папялішча і разваліна Нова-Александраўскага ільнозавода пабудаваць паравы млын і лесапільны завод і адразу прыступілі да работы.

Многа сустракалася цяжкасцей на шляху дасягнення намечанай мэты. Але ўсе яны хутка пераадольваліся ўпорнай працай і няспынным імкненнем хутчэй залячыць раны, нанесеныя нямецкімі захватчыкамі.

Вось што расказвае механік тав. Мярзлоў:

— Мы пачалі аднаўленчую работу з набыцця недастаючых дэталяў і інструмента. Кожную знойдзеную ў развалінах і папялішчах гаечку, болцік, мы па-гаспадарску прыбіралі да рук і пускалі ў справу.

З вялікімі цяжкасцямі мы абсталявалі кузню. Замест кузнечнага меха прыстасавалі лапастны венцілятар. У руінах абгарэлых цагляных абломкаў знайшлі накавальню. Але ў нас не было дастаткова спецыялістаў, каб паспяхова рухаць кузнечныя работы. Тут нам на дапамогу прышлі калгасныя кавалі. Справа пайшла на лад. Хутка ў нас з'явіліся інструменты ўласнага вырабу, зрабілі ўсасваючы клапан і арганізавалі выраб балтоў.

Многа папрацавалі над тым, каб знайсці на месцы недастаючыя дэфіцытныя часткі да лакамабіля. У развалінах і папялішчах быў знойдзен і пушчан у ход 75-мм трансмісійны вал. Знайшлі шасцерні і верацяно для абсталявання млына. Пас для перадачы ў трансмісіі замянілі ланцугом галя. Для забяспечання паравога катла вадой, аднавілі і абсталявалі калодзеж. Так мы прывялі ў становішча поўнай гатоўнасці лакамабіль.

Зараз паравы млын знаходзіцца напярэдадні пуска ў ход. Па тэхнічных разліках млын здолен будзе прапускаць да 30 пудоў зярна ў гадзіну.

З такім-жа энтузіязмам ідзе абсталяванне лесапільнага завода.

Ал. ШУТАЎ.

## *Больш увагі калгаснай жывёлагадоўлі*

# Адновім грамадскую жывёлагадоўлю

Кантрактацыя маладняка — важная крыніца аднаўлення пагалоўя грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах. Суражскі раён у гэтай справе зрабіў ужо пачатак. На 18 лютага закантрактавана ў калгаснікаў, рабочых і служачых 97 цялят.

Паспяхова праходзіць кантрактацыя маладняка ў Краўцоўскім сельсовеце, дзе старшынёй партызан Айчыннай вайны тав. А. Гарэнкоў. Тут закантрактавана 63 галавы маладняка.

Першымі праявілі сваю ініцыятыву па аднаўленню грамадскай жывёлагадоўлі і закантрактавалі цялят члены сельгасарцелі „Чырвоны Металіст" дэпутат сельскага совета Зверава Елена Данілаўна і рахункавод калгаса комсамолка Юрчанка Александра Федосаўна.

Вынікі работы ў раёне па аднаўленню калгаснага стада былі-б значна лепшымі, калі-б усе кіраўнікі сельскіх советаў і калгасаў па-сапраўднаму займаліся гэтым пытаннем. Вось, напрыклад старшыні Пудацкога і Марчонскага сельсоветаў тт. Ласман і Брылёва не надаюць належнай увагі кантрактацыі маладняка. Далей мірыцца з такім становішчам немагчыма. Трэба наверстаць упушчанае ў бліжэйшы час.

І. Е. КУНГУРЦАЎ.
Старшы зоатэхнік
Суражскага райза.

# РЫХТУЮ КОНЕЙ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Два годы да вайны я працаваў конюхам у нашым калгасе „Барацьбіт". Любіў я даглядаць за коньмі. Бывала, яшчэ цёмна, а я бягу на канюшню. Пакуль ехаць на работу, усе коні ў мяне накормлены і напоены. Калгаснікі не скардзіліся на мяне. Коні былі добрай укормленасці, моцныя, а на добрых конях добра было і працаваць. Нормы выпрацоўкі на ворыве, баранаванні і другіх работах заўсёды перавыконваліся. Коней тады было ў нас толькі рабочых да 50 штук і да 20 жарабят.

За час акупацыі нямецкія мярзотнікі ўгналі з нашага калгаса амаль усіх коней. Калі Чырвоная Армія вызваліла наш раён, то ў нашым калгасе засталося толькі 4 кані і яны былі адна худоба.

Мы прыступілі да аднаўлення калгаса. Я зноў стаў конюхам. Яшчэ з большай энергіяй узяўся я за работу. Агульнымі намаганнямі калгаснікаў мы абсталявалі канюшню, уцяплілі яе, пабудавалі кармушкі. Кожны дзень я ўбіраю гной, падсцілаю салому і чышчу коней.

У нас няма сена, але гэта не палохае мяне. Я збіраю на таках мякіну, аўсяную салому, хаджу да калгаснікаў збіраць бульбяныя ачысткі і гэтым кармлю нашых калгасных коней. Корм хоць і не зусім адпавядае ўсім якасцям, але ўкормленасць коней павялічылася. Цяпер на іх можна ездзіць і працаваць. Да вясны я іх папраўлю яшчэ лепш. Перад пасяўной, тыдні на два, пастаўлю на адпачынак і потым пусцім на палявыя работы.

С. ІЛЬІЧОЎ,
конюх калгаса „Барацьбіт"
Мехаўскага раёна.

# Зноў на сцэне свайго клуба

У азнаменаванне 26-й гадавіны Чырвонай Арміі ў Езярышчанскім клубе Мехаўскага раёна адбыўся ўрачысты сход работнікаў партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый. Клуб упрыгожан па святочнаму. На сценах лозунгі, плакаты, партрэты таварышоў Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава. З дакладам аб 26-й гадавіне Чырвонай Арміі выступіў тав. Матвіенка.

Пасля ўрачыстага пасяджэння на сцэне выступіў гурток мастацкай самадзейнасці Езярышчанскай сярэдняй школы. Занавес адкрыла вучаніца 3-га класа Шырокава Флора. Яна перадала прывітанне прысутным ад вучняў школы і аб'явіла, што ўпершыню пасля двух з паловай год нямецкай акупацыі гурток самадзейнасці зноў выступае на сцэне свайго клуба.

У заключэнне была прадэманстрыравана гукавая кіно-карціна „Александр Неўскі".

Е. Л.

## *За рубяжом*

### Замежны друк шырока змясціў загад таварыша Сталіна па поваду 26-й гадавіны Чырвонай Арміі

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза І. Сталіна ў сувязі з 26-ай гадавінай Чырвонай Арміі быў шырока распаўсюджан амерыканскім радыё.

Амерыканскія газеты апублікавалі загад тав. Сталіна на відным месцы. Газета „Нью-Ёрк геральд трыбюн" змясціла загад таварыша Сталіна пад загалоўкам: „Нацысты пазбавіліся 75 проц. сваіх заваяванняў". Загаловак газеты „Нью-Ёрк таймс" гласіць: „Сталін прадбачыць паражэнне праціўніка. 75 проц. акупіраванай тэрыторыі вызвалена. Становішча нацыстаў з'яўляецца безнадзейным".

### Ваенныя дзеянні ў Італіі

Галоўная стаўка войск саюзнікаў у Італіі паведамляе, што на фронце амерыканскай 5-ай арміі ў раёне Анцыо адбываліся ў радзе месц жорсткія сутычкі. На асноўным фронце 5-ай арміі спакойна. На фронце англійскай 8-ай арміі дзеянні патрулёў.

Дрэннае надвор'е перашкаджала аперацыям у паветры.

# *Першыя ўсевобучнікі*

У вызваленых раёнах нашай вобласці на ваенна-вучэбных пунктах кіпіць работа. Тут выкоўваецца наш усевобучнік палітычна-граматным, гарачым патрыётам нашай Радзімы, поўнацэнным рэзервам Чырвонай Арміі. На ваеннай вучобе ўсевобучнік атрымлівае навыкі дзеяння ў баю — перапаўзання, перабежкі, дзеяння лапатай, вучыцца метка страляць, калоць ворага штыком, вывучае матэрыяльную частку зброі і г. д.

Некаторыя нашы раёны часткова ўжо выпусцілі ўсевобучнікаў. Аналіз праробленай работы ваенна-вучэбнымі пунктамі Сіроцінскага, Полацкага райваенкаматаў выявіў вялікую зацікаўленасць усевобучнікаў у ваеннай вучобе, высокую дысцыпліну і паспяховасць.

Вось яны першыя ўсевобучнікі-выдатнікі: па Сіроцінскаму раёну — Афанасьеў Васілій Ефімавіч, вёска Казьянава, Іваноў Васілій Нікіфаравіч, вёска Шалейкі, Андрэеў Віктар Васільевіч, вёска Гарэлая Грыда, Леонаў Якаў Назаравіч, вёска Малькоўская. На гэтым ваенна-вучэбным пункце начальнік лейтэнант т. Рыбін і камандзір узвода малодшы-лейтэнант Шахназараў мабілізавалі ўсю ўвагу і сілы для лепшай пастаноўкі вучэбнай работы і дабіліся нядрэнных вынікаў.

Але побач з вядучымі ваенна-вучэбнымі пунктамі ёсць адстаючыя. Да такіх можна аднесці ВУП Мехаўскага раёна. Тут у наяўнасці і слабая падрыхтоўка да вучобы, мала наглядных дапаможнікаў, слабая патрабавальнасць да навучаючыхся, мала вучаць паказам, а больш расказам (начальнік ВУПа мл. лейтэнант Піскуноў).

Неабходна зараз-жа ўлічыць недахопы работы першых выпускаў і на-хаду перабудаваць усю работу на вучэбных пунктах. ВУПы трэба забяспечыць матэрыяльнай часткай і больш вучыць паказам. Там, дзе кіраўніцтва ВУПаў працуе ў поўным кантакце з партыйнымі, комсамольскімі і совецкімі арганізацыямі, а не ў адрыве ад іх, там справа вучобы на адпаведнай вышыні.

У агульным комплексе ваеннай вучобы чырвонай ніццю праходзіць многагранная палітычная работа на ВУПах. Намеснікі па палітчастцы павінны заўсёды быць сярод усевобучнікаў, пазнаваць іх, выхоўваючы ў іх патрыётаў нашай Радзімы. Палітработа не абмяжоўваецца толькі пастаноўкай добра падрыхтаваных лекцый, яна ідзе на разгортванне рада гутарак усевобучнікаў з героямі Айчыннай вайны, з перапіскі з байцамі-франтавікамі, арганізацыі кінофільмаў, выпуска насценных газет і баявых лісткоў і г. д.

Душой ВУПаў з'яўляецца комсамол. Комсамольцы — застрэльшчыкі здачы норм на абаронныя значкі „ВС", „ПВХО", „ГПА". Лепшую частку моладзі ў часе Усевобуча трэба ўцягнуць у рады ВЛКСМ.

У рабоце ВУПаў немалую ролю іграюць грамадскія арганізацыі — Асоавіяхім, советы фізкультуры. Асабліва вялікую ўвагу і клопаты павінны аказаць і праявіць аб усевобучы мясцовыя органы. Для ВУПаў трэба прадастаўляць лепшыя памяшканні, забяспечыць іх ацяпленнем і асвятленнем.

Толькі гарманічна спалучаючы ваенную вучобу з палітычным выхаваннем байца ўсевобуча, мы дадзім нашай доблеснай Чырвонай Арміі поўнацэнныя рэзервы і тым самым выканаем загад Радзімы і правадыра, Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна.

Маёр ВОЛКАЎ.
Начальнік аддзела Усевобуча Віцебскага Облваенкамата.

Адказны рэдактар
А. КРУШЫНСКІ.